# З ЮБІЛЕЕМ, РОДНЫ БДУ!


# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта

25 кастрычніка 2001 года, № 14-15 (1843-1844)




Фота IREX/PROMEDIA

**ДАРАГІЯ СЯБРЫ!**

У першы год тысячагоддзя Беларускі дзяржаўны універсітэт адзначае свой 80-гадовы юбілей. За гэты час – гады развіцця і сталення — наш універсітэт дасягнуў значных поспехаў. Сёння БДУ не проста вышэйшая навучальная ўстанова. Беларускі дзяржаўны універсітэт — гэта адзіны навучальна-навукова-вытворчы комплекс з вялікім інтэлектуальнымі магчымасцямі і патэнцыялам.

Дзякуючы вам, вашай працы універсітэт не толькі з гонарам пранёс свае каштоўнасці і традыцыі праз вельмі цяжкія гады, але і сёння, як і раней, выконвае сваё галоўнае прызначэнне — служэнне Бацькаўшчыне, выхаванне творчай асобы. Менавіта вы, навуковыя супрацоўнікі, выкладчыкі, студэнты і выпускнікі, усе тыя, хто нясе ў сабе дух Універсітэта, хто сваёй творчай працайператварае наш свет па законах прыгажосці, высокай маралі і духоўнасці, — наша агульнае і галоўнае багацце.

Давайце і надалей высока трымаць марку найлепшага універсітэта краіны, ад якога шмат у чым залежыць, якой будзе наша Беларусь у наступныя гады.

У гэтыя святочныя дні я жадаю ўсім вам творчага ўздыму, далейшага інтэлектуальнага росквіту, вялікіх поспехаў у навучальнай і навукова-даследчай дзейнасці.

*Рэктар Беларускага дзяржаўнага універсітэта,*
*прафесар А.У. КАЗУЛІН*

**СВЯТОЧНАЯ АФІША**

# БДУ — 80!

## 30 кастрычніка – дзень нараджэння універсітэта

Беларускі дзяржаўны універсітэт шырока адзначае свой юбілей. Шмат мерапрыемстваў прымеркавана да гэтай даты. Некаторыя з іх мы зараз назавём. Аднак усё ж будуць і сюрпрызы, пра якія вы даведаецеся толькі падчас свята.

Святочны тыдзень адкрыецца **27 кастрычніка. На стадыёне "Дынама"** з 15-й да 21-й гадзіны пройдзе **АРТ-футбол** паміж камандамі футбольнага клуба зорак Расіі "СТАРКО" і зборнай КВЗ БДУ плюс "АРТ СТАРС". Расіян прадставяць капітан Юрый Давыдаў з групы "Зодчие", Андрэй Губін, Мікалай Трубач, Дзмітрый Харацьян, а беларускі бок — капітан Альберт Скараход, Анатоль Длускі, Ягор Хрусталёў, Андрэй Хлястоў, Аляксей Жданоўскі і іншыя. Матч завершыцца гала-канцэртам. Дарэчы, білеты на гэты футбольны матч можна будзе набыць у пакоях 201, 203, 211 галоўнага корпуса БДУ.

**Выстава "БДУ — 80"** будзе працаваць **з 29 кастрычніка па 3 лістапада ў актавай зале галоўнага корпуса універсітэта** з 10.00 да 18.00. Асноўныя яе накірункі — навукова-тэхнічныя распрацоўкі, адукацыя і адукацыйныя тэхналогіі, культурна-асветніцкая спадчына БДУ. Тут вы зможаце пазнаёміцца з абсталяваннем, прыладамі, новымі вытворчымі тэхналогіямі, праграмным забеспячэннем і праграмна-тэхналагічнымі комплексамі, распрацаванымі ў БДУ. Апроч таго, на выставе вам прадаставяць поўную інфармацыю пра спецыяльнасці і прафесіі, па якіх вядзецца падрыхтоўка ў БДУ, а таксама пра новыя формы навучання, тэхналогіі ў навучальным працэсе, пра міжнародны абмен студэнтамі. Што датычыцца культурна-асветніцкай спадчыны універсітэта, даведацца пра яе можна будзе, наведаўшы музеі БДУ, прагледзеўшы унікальныя фонды Фундаментальнай бібліятэкі, архівы, выданні кафедраў і іншых падраздзяленняў нашага універсітэта.

**29 кастрычніка** ў 14 гадзін **у актавай зале Ліцэя БДУ** адбудзецца пашыранае **пасяджэнне Вучонага савета БДУ**, а таксама ўрачыстае ўручэнне прэмій імя У.І. Пічэты і імя А.Н. Сеўчанкі.

**29 кастрычніка** абяцае стаць **вечарам рамансa**. У 19 гадзін **у канцэртнай зале Ліцэя БДУ** выступяць салісты оперы і філармоніі ў суправаджэнні Народнага аркестра народных інструментаў БДУ, мастацкім кіраўніком і дырыжорам якога з'яўляецца Алег Шпілеўскі. Са сваёй праграмай на сцэну выйдзе і група "Voks".

**Помнік святому Кірылу Тураўскаму**, славутаму асветніку Беларусі, будзе ўрачыста адкрыты **30 кастрычніка** ў 12 гадзін **ва універсітэцкім дворыку**.

Новы помнік падрыхтаваны спецыяльна нашаму універсітэту да яго 80-гадовага юбілею.

Для Беларусі святы Кірыла Тураўскі — асоба, якая па значнасці не саступае Еўфрасінні Полацкай. Нездарма ён, як і святая Еўфрасіння, лічыцца нябесным апекуном і заступнікам Беларусі.

Аўтар помніка — малады скульптар Аляксандр Прохараў, выпускнік Беларускай акадэміі мастацтваў. Гэта першы помнік маладога творцы. На стварэнне скульптуры быў абвешчаны конкурс, у якім удзельнічалі 6 праектаў.

Перад гледачамі з'явіцца постаць Кірылы Тураўскага ў манаскім убранні. У левай руцэ задуменны манах будзе трымаць кнігу, у правай — пяро. Пастамент для скульптуры ўжо рыхтуецца.

**Урачыстае пасяджэнне і святочны канцэрт** пройдуць, як і мае быць, **30 кастрычніка** — у дзень нараджэння БДУ.

**1 лістапада** ў 12 гадзін адбудзецца **ўрачыстае адкрыццё** адрамантаванага **корпуса фізічнага факультэта**.

**2 лістапада ў Палацы спорту** ў 19.00 выступіць музычная **група "Чайф"**. Мерапрыемства будзе платным, білеты на яго можна набыць у касах горада.

**3 лістапада** з 11 да 16 гадзін **перад Палацам спорту** сваю дзейнасць разгорне **палатачны гарадок "Кірмаш факультэтаў"**. Мэта яго правядзення — прэзентацыя ўсіх факультэтаў БДУ, а таксама з'яднанне студэнцкай моладзі, стварэнне атмасферы нефармальных зносін. У палатачным гарадку факультэты змогуць прадставіць усе віды мастацкай самадзейнасці, конкурсы, спаборніцтвы, забаўляльныя мерапрыемствы. Гарадок павінен стаць вострavам радасці і весялосці, студэнцкай бесшабашнасці і задору. Можа, таму менавіта падчас гэтага мерапрыемства будуць арганізаваны яшчэ і байкшоу, конна-спартыўны турнір, выступленне творчых калектываў. Арганізатары абяцаюць буфеты з рознымі прысмакамі.

Сапраўдным падарункам для студэнтаў стане **танцавальна-забаўляльная праграма "Энергія новага веку"**, якая пачнецца **ў Палацы спорту 3 лістапада** ў 18 гадзін, а закончыцца пад раніцу **4 лістапада**. У ёй прымуць удзел артысты з Расіі, а вядучымі будуць папулярныя дыджэі мінскіх радыёстанцый і начных клубаў.

Адным словам, планы грандыёзныя. Іх размах захапляе. Думаю, уражанні будуць яшчэ больш шыя, калі вы наведаеце ўсе вышэй пералічаныя мерапрыемствы.

*Ганна АНАТОЛЬЕВА*

З НАГОДЫ

# На БДУ ляжыць вялікая адказнасць

*Адкрыццё БДУ – падзея вялікай культурнай важнасці. Яно дасць моцны штуршок для развіцця беларускай культуры, разаўе яе і пакажа ўсяму свету, чаго можа дасягнуць народ, які разбіў ланцугі бясправ'я і рабства.*
*Рэктар Уладзімір Іванавіч Пічэта*

*Гісторыя вучыць, што ў любых самых складаных умовах універсітэты былі галоўнымі асяродкамі захавання фундаментальных каштоўнасцяў, грамадскай маралі, народных традыцый, аказвалі самае рашучае супраціўленне дэструктыўным працэсам. Менавіта універсітэты лепш, чым іншыя сацыяльныя інстытуты, здольныя ўбачыць, выдзеліць найбольш значнае і істотнае, што адбываецца ў грамадстве, глыбока прааналізаваць рэальныя працэсы і быць праваднікамі новага.*

*Галоўнаму універсітэту краіны сёння 80 гадоў. Лічба немалая. Напярэдадні свята мы сустрэліся з рэктарам Беларускага дзяржаўнага універсітэта, прафесарам Аляксандрам Уладзіслававічам КАЗУЛІНЫМ.*



*— Ужо колькі гадоў, як БДУ нададзены статус нацыянальнага універсітэта. Наколькі добра універсітэт спраўляецца з новымі задачамі?*

— Статус універсітэта — гэта не толькі і не столькі ільготы, колькі дадатковая адказнасць за развіццё адукацыі ва універсітэце і ў краіне ў цэлым. Менавіта мы павінны першымі заўважаць і рэагаваць на недахопы сістэмы адукацыі, весці аналіз развіцця сусветнага адукацыйнага працэсу і своечасова адгукацца на тэндэнцыі, якія ў ім з'яўляюцца. Наш універсітэт павінен удзельнічаць у фарміраванні асноў дзяржаўнай адукацыйнай палітыкі, ствараць і апрабоўваць новыя адукацыйныя тэхналогіі, рыхтаваць кадры для іншых універсітэтаў і адыгрываць вядучую ролю ў распрацоўцы дзяржаўных стандартаў. Тут павінны праходзіць апрабацыю ўсе адукацыйныя навінкі: тэхналагічныя, нарматыўныя, упраўленчыя.

Ужо сёння мы выступаем лідэрамі ў распрацоўцы адукацыйных стандартаў і нарматываў вышэйшай школы. Без рэцэнзіі БДУ не прымаецца ні адзін сур'ёзны дзяржаўны дакумент або закон. Не ўяўляецца правядзенне акрэдытацыі любой беларускай ВНУ без удзелу спецыялістаў БДУ. Нам дадзена права прысвойваць вучоныя званні дацэнта і прафесара. БДУ мае права выступаць у якасці дзяржаўнага заказчыка па дзяржаўных навукова-тэхнічных праграмах і асобных заказах.

*— Як удасканальваецца адукацыйны працэс у БДУ і чым абумоўліваецца такая неабходнасць?*

— Пазалетась у Балоны міністры адукацыі 28 еўрапейскіх краін дамовіліся наконт узгаднення пазіцый пры пераходзе да адзінай адукацыйнай сістэмы еўрапейскай супольнасці. Яна прадугледжвае двухступенную сістэму падрыхтоўкі спецыялістаў. Гэта значыць, што за чатыры гады навучання выпускнік атрымлівае ступень бакалаўра, а за шэсць — магістра. Большасць усходнееўрапейскіх краін і краін СНД таксама перайшла на такую схему навучання. На жаль, у Беларусі толькі з 1994 года прынята сістэма, згодна з якой, каб стаць бакалаўрам, трэба вучыцца 5 гадоў на "добра" і "выдатна", атрымаць ступень спецыяліста і яшчэ прайсці дадатковае навучанне ў аб'ёме 300 гадзін. Такога няма ні ў адной краіне свету. Таму ў БДУ, як, дарэчы, і ў Расіі, зараз адпрацоўваецца трохступенная сістэма: бакалаўр — спецыяліст — магістр. Гэта значыць, што пасля чатырох гадоў навучання асобныя студэнты могуць атрымаць дыплом бакалаўра і закончыць на гэтым сваю адукацыю. Дыплом спецыяліста з вышэйшай адукацыяй можна атрымаць і за пяць гадоў. Праграма навучання ў магістратуры разлічана на шэсць гадоў, у канцы навучання абараняецца магістэрская работа. Дарэчы, плануецца, што лепшыя выпускнікі іншых ВНУ краіны змогуць працягнуць навучанне ў двухгадовай магістратуры БДУ па профілі атрыманай спецыяльнасці. Канешне, з цягам часу прамежкавая пяцігадовая ступень знікне, застанецца толькі двухступенная сістэма вышэйшай адукацыі, як і ў большасці краін свету.

Мы імкнуліся распрацаваць такую сістэму ацэнкі якасці ведаў, якая будзе аб'ектыўна прымушаць студэнтаў да пастаяннай і сістэматычнай працы на працягу ўсяго навучальнага года, развіваць інтэлектуальныя здольнасці і навыкі разумовай дзейнасці, уменне вылучаць неабходную інфармацыю і працаваць з ёй. Для таго каб істотна палепшыць якасць навучання студэнтаў, нам трэба будзе перамясціць акцэнты з традыцыйных спосабаў рэтрансляцыі ведаў і традыцыйных формаў арганізацыі навучальнага працэсу да новых формаў, у якіх ролі студэнта і выкладчыка прынцыпова змяняюцца. Галоўная мэта выкладчыка — навучыць студэнта вучыцца, іншымі словамі — уцягнуць студэнта ў працэс навучання, арганізаваць яго самастойную аналітычную сістэмную працу. Вопыт даказвае, што ў такіх умовах студэнт значна хутчэй вучыцца рашаць творчыя задачы. Ён пачынае больш асэнсавана і адказна ставіцца да сваёй прафесійнай будучыні, вучыцца планаваць яе ўжо са студэнцкіх гадоў, стараецца працаваць прафесійна.

Такі студэнт аказваецца значна больш падрыхтаваным да ўвядзення гнуткай структуры універсітэцкай адукацыі. З'яўляецца магчымасць паступова пашыраць шматузроўневую падрыхтоўку, што дазваляе студэнтам выбіраць узровень навучання на розных яго стадыях. Дыверсіфікацыя сістэмы адукацыі — гэта адказ на выклік часу, на фармаванне адзінай адукацыйнай і інфармацыйнай прасторы, інтэграцыйныя працэсы.

*— Што ўкладваецца ў паняцце "якасць адукацыі"?*

— Калі мы гаворым пра "якасць адукацыі", гэта не значыць, што мы зараз рыхтуем слабых спецыялістаў. Проста сёння мы ўжо ў стане ўзняць планку патрабаванняў да якасці падрыхтоўкі нашых выпускнікоў. Я ўпэўнены, што нашы спецыялісты павінны і могуць канкурыраваць на рынках працы са спецыялістамі з любой краіны, з выпускнікамі вядучых універсітэтаў свету.

Якасць адукацыі ў яе сучасным разуменні ўключае ў сябе не толькі прафесійны, але асабісты і грамадзянскі аспекты фарміравання спецыяліста, і яна ні ў якім разе не павінна зводзіцца да балаў у залікоўцы.

Мы не можам пайсці па шляху зніжэння патрабавальнасці да падрыхтоўкі спецыялістаў, якога прытрымлівалася ў апошнія гады большасць недзяржаўных, і нават некаторыя дзяржаўныя ВНУ.

Шмат увагі БДУ надае пытанню пра пашырэнне прызнання дыплома універсітэта за мяжой, а таксама магчымасці выдачы двайных дыпломаў, рэалізацыі сумесных адукацыйных праграм з іншымі краінамі.

Зразумела, у многім тут заслуга выкладчыкаў БДУ. Колькасць прафесарска-выкладчыцкага саставу ў цяперашні час складае больш за 2000 чалавек, з іх больш за 350 — дактары навук і больш за паўтары тысячы — кандыдаты навук. З агульнай колькасці штатных выкладчыкаў кожны дзесяты мае ступень доктара навук і кожны другі — кандыдата навук.

Сёння ў БДУ сканцэнтраваны лепшыя кадры, якія характарызуюцца высокім прафесіяналізмам, дастатковым практычным вопытам выкладчыцкай работы, высокімі маральнымі якасцямі.

*— З якой мэтай ствараюцца адпаведныя навукова-вытворчыя структуры ў БДУ?*

— Давайце не забываць, што роля БДУ ў беларускім грамадстве далёка не вычэрпваецца адукацыйнай сферай. Вучоныя універсітэта маюць сёння дагавор аб супрацоўніцтве практычна з усімі вядучымі міністэрствамі, Нацыянальным банкам, самымі буйнымі і перадавымі прамысловымі прадпрыемствамі Беларусі. На рэкамендацыі нашых спецыялістаў разлічваюць і арыентуюцца органы дзяржаўнага кіравання. Універсітэт працуе на рэальную эканоміку, на дзяржаву. І з кожным днём узрастае аддача ад гэтай працы.

Беларускі дзяржаўны універсітэт з'яўляецца не толькі буйнейшым адукацыйным цэнтрам Рэспублікі Беларусь, але і адным з самых буйных навуковых цэнтраў, да ліку якіх адносяцца, безумоўна, Нацыянальная Акадэмія навук Беларусі, галіновыя інстытуты, якія ўваходзяць у склад розных міністэрстваў і ведамстваў. Натуральна, што ў сілу гэтых функцый, звязаных не толькі з працэсам падрыхтоўкі кадраў высокай і вышэйшай кваліфікацыі і навуковых даследаванняў, БДУ мае буйную структуру. У склад універсітэта акрамя факультэтаў уваходзяць навукова-даследчыя інстытуты, цэнтры, а таксама створана інфраструктура навукова-вытворчай дзейнасці. Звычайна класічны універсітэт — гэта структура, якая прызначаецца для выканання функцый адукацыйнага, навуковага і культурнага цэнтра. Але ў сучасных умовах, калі дасягненні навукі робяцца вызначальнымі ў перспектыве развіцця грамадства, проста займацца навуковымі даследаваннямі — недастаткова. Важна адсочваць іх укараненне ў практыку — аж да атрымання эканамічнага выніку. Звычайна гэтым займаюцца галіновыя інстытуты, прадпрыемствы. Таму мы ў нейкай ступені відазмянілі канцэпцыю класічнага універсітэта, і ў якасці чацвёртай дадатковай сферы, якая інтэнсіўна развіваецца, разглядаем навукова-вытворчую, або так званую навукова-інавацыйную дзейнасць. У сувязі з гэтым у нас з'явіўся блок уласных прадпрыемстваў, якія выпускаюць разнастайную прадукцыю. Гэтую прадукцыю мы рэалізуем самі, атрымліваем прыбытак і выкарыстоўваем яго для развіцця інфраструктуры БДУ. (У цэлым, штогадовая эканомія дзяржбюджэтных сродкаў у выніку навукова-вытворчай дзейнасці БДУ складае не менш за 3-4 мільёны долараў.) Гэта, мабыць, прынцыпова новы момант. Падобная практыка развіваецца ў ЗША, Кітаі і г.д. Што датычыцца Еўропы і краін СНД, дык такіх захадаў няма амаль нідзе, апроч нашага універсітэта. Ёсць толькі меркаванні кіраўніцтва адпаведных універсітэтаў, што такую практыку неабходна ўводзіць. Мы можам пра гэта гаварыць на падставе нашых прамых кантактаў з вядучымі універсітэтамі СНД і Еўропы, ЗША, Кітая.

*— Апошнія гады ва універсітэце ідзе актыўнае абнаўленне і стварэнне матэрыяльна-тэхнічнай базы...*

— Так, мы вельмі шмат увагі надаем гэтаму пытанню. Даўно вядома, што навакольнае асяроддзе стварае і маральную і духоўную атмасферу ўнутры нас. Мы павінны ставіцца да універсітэта не менш ашчадна, чым да ўласнага дома. Для гэтага ва універсітэце павінны быць створаны такія ўмовы, дзякуючы якім супрацоўнікі і студэнты універсітэта імкнуліся б праводзіць менавіта тут большую частку свайго часу: займацца не толькі прафесійнай або вучэбнай дзейнасцю, але і адпачываць, мець сяброўскія зносіны і адчуваць далучанасць да шматлікай універсітэцкай супольнасці і заўсёды ганарыцца гэтым.

*— А ў чым, па-вашаму, перавагі студэнтаў нашага універсітэта перад студэнтамі іншых ВНУ Беларусі?*

— Студэнтамі БДУ становяцца далёка не ўсе абітурыенты, а толькі лепшыя з лепшых. Студэнты — гэта наша будучыня, гэта заўтрашні дзень Беларусі. І мы прыкладаем усе намаганні, каб яны зразумелі, што навучацца ў БДУ — гэта не толькі гонар, але і вялікая адказнасць.

*Ганна АНАТОЛЬЕВА*



Фота IREX/PROMEDIA

*• 20-я гады – адзін з самых дынамічных перыядаў у гісторыі БДУ. У гэты час усё было ўпершыню: першыя студэнты, першыя факультэты, першыя кафедры, першыя навуковыя экспедыцыі, першыя выпускі першых беларускіх спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй.*

АСОБЫ

# БДУ: інтэграцыя навукі і адукацыі

*БДУ – першая вышэйшая школа і першы навукова-даследчы цэнтр Савецкай Беларусі...*
*Рэктар Язэп Пятровіч Каранеўскі*

*У БДУ, як вядома, сабраліся лепшыя педагагічныя кадры. Ёсць сярод іх і акадэмікі Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі. Іх аўтарытэт сярод калег і студэнтаў неаспрэчны. Яны дзеляцца з чытачамі "Беларускага універсітэта" сваімі поглядамі на навуку, на перспектывы яе развіцця ва універсітэце.*

*Фёдар Мікалаевіч КАПУЦКІ з 1994 года — правадзейны член НАН Беларусі. Зараз працуе ў НДІ ФХП. Загадчык аддзела фізіка-хіміі полісахарыдаў.*



Перш за ўсё хачу сардэчна павіншаваць студэнтаў, аспірантаў, прафесарска-выкладчыцкі састаў, супрацоўнікаў шматтысячнага калектыву Беларускага дзяржаўнага універсітэта з юбілеем — 80-годдзем з дня заснавання.

Сёння наш флагман на ўздыме. Я шчаслівы, што вось ужо 52 гады маё жыццё непарыўна звязана з нашай вядучай ВНУ.

Поспех кожнай вышэйшай навучальнай установы ствараецца трыма складнікамі: наяўнасцю здольных працалюбівых студэнтаў, кваліфікаваным прафесарска-выкладчыцкім саставам і адпаведным сучасным узроўнем матэрыяльнай базы (у шырокім сэнсе гэтага паняцця).

Што датычыць БДУ, дык першыя два складнікі сумненняў не выклікаюць. Ва універсітэце заўсёды можна было выбраць студэнтаў з найлепшых у рэспубліцы абітурыентаў, прафесарска-выкладчыцкі састаў — вельмі кваліфікаваны, здольны рыхтаваць спецыялістаў самай высокай якасці.

А што да базы — я вельмі рады, што наш рэктарат і асабліва рэктар, прафесар А.У. Казулін вельмі адукавана, напорыста, з глыбокім разуменнем і паспяхова вырашае і гэтую задачу.

У БДУ будуюцца новыя ўтульныя карпусы і інтэрнаты, рэканструіруюцца і рамантуюцца наяўныя; лабараторыі і інстытуты забяспечваюцца сучаснымі сродкамі інфармацыі, сучасным абсталяваннем і прыладамі; арганізоўваецца сістэма грамадскага харчавання, абнаўляюцца навучальныя базы на шэрагу факультэтаў...

Рэктарат надае першаступеннае значэнне якасці падрыхтоўкі спецыялістаў, стварэнню новых факультэтаў, прагрэсіўных спецыяльнасцей і спецыялізацый, абнаўленню навучальных планаў, увядзенню новых метадаў навучання, шматузроўневай падрыхтоўцы спецыялістаў. І ўсё гэта робіцца на навуковай аснове.

Я павінен адзначыць, што інтэграцыя навукі і адукацыі стала неад'емнай часткай нашага жыцця, жыцця універсітэта. У БДУ жыве свабодная навука, бо без яе нельга падрыхтаваць спецыялістаў ні з вялікімі ведамі, ні з магчымасцямі далейшага развіцця.

Вядома ж, навука ў БДУ — на пярэднім плане. Пры гэтым рэктарат не толькі і не столькі імкнецца атрымаць фінансаванне на навуку, а робіць усё, каб навука, навуковыя даследаванні былі накіраваныя на вырашэнне канкрэтных праблем, мелі рэальную эканамічную аддачу, рэальны вынік. Тут разумеюць, што даваць справаздачу артыкуламі — час сышоў.

Гэта натхняе, бо ва універсітэце разумеюць: адукацыя — аснова высокай якасці нашага жыцця, крыніца нашай эканамічнай магутнасці і бяспекі, творчасці ў мастацтве і літаратуры, вынаходлівасці ў прыродазнаўчых навуках, неўміручасці культурных каштоўнасцяў.

Кажуць, што ў Амерыцы добрыя універсітэты не таму, што яна багатая, а яна багатая таму, што ў яе добрыя універсітэты.

Да гэтага магу дадаць толькі адно: для нас адукацыя не толькі аснова таго, што мы маем, але і адзіная надзея на будучыню, бо разлічваць трэба на развіццё інтэлектуальнага патэнцыялу народа, на навуковы і тэхнічны прагрэс, на наяўнасць высокакваліфікаваных, прафесійна падрыхтаваных кадраў. Усё гэта натхняе нас на больш эфектыўную працу, працу, якая прыносіць рэальныя вынікі.

*Вадзім Васільевіч СВІРЫДАЎ з 1989 года з'яўляецца акадэмікам НАН Беларусі . Загадчык кафедры неарганічнай хіміі БДУ з 1965 года.*

Наш універсітэт заўжды прываблівае да сябе найлепшых выпускнікоў школ рэспублікі, і значная частка лепшых выпускнікоў універсітэта заставалася ў ім пасля заканчэння навучання для навуковых даследаванняў і падрыхтоўкі дысертацый. Ва універсітэце заўжды было шмат добрых студэнтаў. Іх не стала менш у апошнія гады, а сярод студэнтаў хімічнага факультэта добрасумленных студэнтаў у апошнія гады стала больш, чым 8-12 гадоў таму. Добры, працаздольны калектыў выкладчыкаў і супрацоўнікаў, высакаякасная падрыхтоўка выпускнікоў, іх здольнасць творча выкарыстоўваць свае веды пры выкананні прафесійных абавязкаў — вось тое, што застаецца нязменным ва універсітэце на працягу паўстагоддзя.

У сярэдзіне мінулага стагоддзя ўвесь БДУ быў меншым за адзін цяперашні факультэт. І справа не толькі ў малой колькасці студэнтаў і выкладчыкаў, у невялікай колькасці спецыяльнасцяў і спецыялізацыяў ва універсітэце саракавых-пяцідзесятых гадоў. Не было прымальных умоваў для выканання навуковых даследаванняў. Асабліва гэта ўскладняла дзейнасць факультэтаў прыродазнаўчага профілю.

Да сярэдзіны сямідзесятых гадоў універсітэт вельмі вырас ва ўсіх адносінах. Ён стаў буйным цэнтрам навукі ў рэспубліцы, рыхтаваў не толькі студэнтаў, але і спецыялістаў з навуковымі ступенямі. Вельмі істотна, што ён не страціў сваё навуковае аблічча і зараз пры ўсіх тых эканамічных цяжкасцях, якія адчувае краіна. Ён працягвае быць цэнтрам навуковых даследаванняў, якія па



шмат якіх накірунках вядуцца на вельмі высокім сучасным узроўні нягледзячы на нястачу каштоўнага навуковага абсталявання. Нельга не адзначыць, што ў гэтым немалая заслуга кіраўніцтва універсітэта. Прыемна ўсведамляць, што не аслабляецца цікавасць да навукі сярод студэнтаў, што некаторыя студэнты выконваюць сур'ёзныя даследаванні, супастаўляльныя па сваёй навуковай і практычнай значнасці з даследаваннямі тых, хто рыхтуе дысертацыйныя працы.

З таго моманту, як я стаў кіраўніком дысертацыйнай працы майго першага аспіранта і стаў загадчыкам кафедры, мая праца была складовай часткай працы калектыву, які на працягу мноства гадоў складаўся з некалькіх дзесяткаў людзей — навуковых супрацоўнікаў, выкладчыкаў, аспірантаў. На кафедры неарганічнай хіміі і ў лабараторыях інстытута, якія шчыльна з ёй супрацоўнічаюць, сфармаваўся эфектыўна функцыянуючы навуковы накірунак, які вывучае заканамернасці працэсаў утварэння высокадысперсных цвёрдых рэчываў і магчымасці стварэння з іх дапамогай новых матэрыялаў з разнастайнымі ўласцівасцямі. Гэты навуковы накірунак паспяхова развіваецца на хімічным факультэце і ў інстытуце і зараз. Сотні навуковых публікацыяў, у тым ліку і ў замежных часопісах, дзесяткі навуковых дакладаў на міжнародных навуковых нарадах, каля васьмідзесяці кандыдацкіх дысертацыяў, абароненых аспірантамі і навуковымі супрацоўнікамі нашага навуковага калектыву, сем доктарскіх дысертацыяў, вялікая колькасць распрацаваных тэхналагічных працэсаў, важных для розных галінаў тэхнікі, некалькі навучальных дапаможнікаў, якія атрымалі ўхвалу на кафедрах мноства універсітэтаў Савецкага Саюза, — вось асноўны пералік таго, што зрабіў наш навуковы калектыў. Мне прыемна ўсведамляць, што з нашага калектыву выйшлі не толькі буйныя ці проста добрыя даследчыкі і выкладчыкі, але і шэраг асобаў, якія выказалі сябе як дасведчаныя арганізатары навукі і вышэйшай школы.

Сярод сваіх вучняў я магу назваць акадэміка А.І. Лесніковіча (зараз старшыню Камітэта па навуцы пры Савеце Міністраў), прафесара Г.А. Браніцкага — дэкана хімічнага факультэта БДУ, доктара хімічных навук С.К. Рахманава — прарэктара па навуковай рабоце БДУ і інш.

*Аляксандр Фёдаравіч ЧАРНЯЎСКІ з лютага 1979 года і па цяперашні час дырэктар НДІ ПФП імя А.Н. Сеўчанкі. З 1994 года — акадэмік НАН Беларусі.*



З 80-гадовай гісторыі існавання універсітэта апошнія 40 гадоў праходзілі на маіх вачах. Гэта, вядома, у большай ступені датычыць развіцця навуковых даследаванняў. У гэты перыяд вызначальны ўплыў на станаўленне шэрага найважнейшых навуковых даследаванняў, якія дагэтуль застаюцца найбольш актуальнымі і развітымі, аказалі акадэмікі АН БССР А.Н. Сеўчанка і Л.В. Валадзько.

На маю думку, істотныя дасягненні атрыманы створанымі гэтымі навукоўцамі школамі оптыкаў-спектраскапістаў і радыёфізікаў. Работы гэтых школаў у перыяд з пачатку 80-х гадоў і да цяперашняга часу адзначаны двума Дзяржаўнымі прэміямі СССР і трыма Дзяржаўнымі прэміямі БССР, трыма прэміямі Савета Міністраў СССР і БССР, трыма Дзяржаўнымі прэміямі Рэспублікі Беларусь. Вялікую пазітыўную ролю ў развіцці фізікі і падрыхтоўцы кадраў вышэйшай кваліфікацыі ва універсітэце, як і ва ўсёй рэспубліцы, адыгралі значныя савецкія навукоўцы акадэмік АН СССР і БССР М.А. Барысевіч, акадэмікі Б.І. Сцяпанаў, Ф.І. Фёдараў, М.А. Ельяшэвіч, А.К. Красін, Л.І. Кісялеўскі, У.А. Піліповіч і інш. На жаль, у апошнія дзесяць гадоў навука, і асабліва фізіка, адчуваюць значныя цяжкасці, абумоўленыя пераважна рэзкім скарачэннем фінансавання і, як вынік, зніжэннем прэстыжнасці працы навукоўцаў. Скараціліся многія важныя накірункі навуковых даследаванняў: гідраакустыка, радыёоптыка, радыяцыйнае матэрыялазнаўства і лазерная лакацыя.

Варта адзначыць дзіўную трываласць некаторых навуковых калектываў, якія атрымалі новыя навуковыя вынікі ў галіне оптыкі і спектраскапіі, у лазернай плазмадынаміцы, лазернай фізіцы і тэхніцы, радыёфізіцы і інфарматыцы. У цэлым, у мяне не знікае надзея на паляпшэнне ўмоваў існавання навукі і навукоўцаў.

Эфектыўныя намаганні кіраўніцтва рэспублікі і універсітэта па перабудове ўсіх бакоў жыцця універсітэта ў накірунку да сусветных стандартаў — надзейная аснова для такога аптымізму.

*• У гісторыі Беларускага дзяржаўнага універсітэта, як у люстэрку, адбілася ўся гісторыя Беларусі найноўшага часу. Усё тое, што адбывалася ў краіне, заўсёды праходзіла праз увасабленне яе інтэлекту – універсітэт.*

*Анатоль Іванавіч ЛЕСНІКОВІЧ — прафесар, акадэмік НАН Беларусі. З верасня 2000 года — старшыня Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях (зараз — Камітэт па навуцы пры Савеце Міністраў) Рэспублікі Беларусь. Загадчык кафедры агульнай хіміі БДУ.*

З самымі цёплымі пачуццямі віншую ўсіх супрацоўнікаў роднага універсітэта з 80-годдзем з дня яго заснавання! Беларускі дзяржаўны універсітэт — сапраўдны цэнтр адукацыі, навукі і культуры нашай дзяржавы — зрабіў неацэнны ўклад у інтэлектуальны патэнцыял беларускай нацыі, прызнанай у свеце адной з найбольш развітых. Выпускнікі БДУ складаюць аснову кадравага патэнцыялу навукі ў нашай краіне, годна прадстаўляючы беларускую навуку на сусветным узроўні. Я шчаслівы тым, што магу падзяліць з вамі, дарагія калегі, пачуццё законнага гонару за наш універсітэт ад таго, што ў нашым універсітэце я знайшоў сваіх настаўнікаў, якія дапамаглі мне зрабіць пасільны ўклад у навуку і развіццё універсітэта; ад таго, што, сыходзячы, я ніколі не сыходзіў з яго.

Так бывае заўсёды, што больш не ўдаецца зрабіць, чым удаецца, але сёння — пра тое, што ўдалося дзякуючы высокаму аўтарытэту БДУ.

Першая група студэнтаў і аспірантаў, адпраўленая на навучанне за межы СССР на пачатку цяпер ужо далёкіх 60-х, была сфармаваная з пяці студэнтаў БДУ і аспірантаў расійскіх, пераважна маскоўскіх, ВНУ. Я апынуўся ў гэтай групе. Яна была накіраваная ва універсітэт Гумбальта (Берлін), пасля залічэння ў які я выканаў дыпломную работу ў Нямецкай акадэміі навук пад кіраўніцтвам прэзідэнта гэтай акадэміі, вядомага хіміка Гюнтэра Рынэкера. Дыпломная работа ўдалася, бо па ёй былі апублікаваныя тры навуковыя артыкулы ў міжнародным часопісе. Думаю, што ў гэтым я ў значнай ступені абавязаны маім першым настаўнікам В.В. Свірыдаву і Г.А. Браніцкаму, якія з першага курса навучання ў БДУ апякалі маю студэнцкую навуковую працу. Таму, з'язджаючы ў ГДР, я ўжо меў у суаўтарстве з імі два навуковыя артыкулы. Дыпломная работа легла і ў аснову маёй кандыдацкай дысертацыі.

У далейшым мне давялося займацца даследаваннямі па абароннай тэматыцы. Я пераканаўся, што заказы па такой тэматыцы можна было атрымаць толькі дзякуючы вядомасці універсітэта і яго навукоўцаў. Абапіраючыся на гэтую вядомасць, мне ўдалося наладзіць добрае творчае супрацоўніцтва з буйнымі навукоўцамі і арганізатарамі навукі, цяпер сапраўднымі членамі РАН Г.В. Саковічам, Г.Б. Манелісам, а пазней і з А.Г. Мяржанавым, знаёмства з якімі і было той раскошай, якая часам дастаецца чалавеку. Мая доктарская дысертацыя (і не толькі мая) была плёнам гэтага супрацоўніцтва.



Стварэнне навукова-даследчых інстытутаў у структуры БДУ, па сутнасці, было прызнаннем на дзяржаўным узроўні дасягненняў універсітэцкіх навукоўцаў, іх укладу ў вырашэнне маштабных задач таго часу. Навукоўцы атрымалі дадатковыя магчымасці і з поспехам карысталіся імі. Пачала развівацца навукова-інавацыйная дзейнасць. У цяжкі час пачатку 90-х рэктар Ф.М. Капуцкі падтрымаў гэтае пачынанне, і без перабольшання можна сказаць, што рэктарат заклаў арганізацыйныя асновы інавацыйнай дзейнасці, якая атрымала інтэнсіўнае развіццё ў апошнія пяць гадоў. Сваю прыналежнасць да арганізацыі гэтай дзейнасці падчас працы ў рэктарацe заўсёды прыгадваю з пачуццём падзякі ўсім, хто спрыяў гэтай арганізацыі, непасрэдна ажыццяўляў канкрэтныя распрацоўкі альбо падсілкоўваў ідэямі, як гэта рабіў ганаровы доктар БДУ В.Е. Шукшуноў.

Напрыканцы хацеў бы адзначыць, што навуковыя даследаванні і інавацыйная дзейнасць ва універсітэце ўтвараюць тую аснову, на якой можна развіваць самыя сучасныя навучальна-даследчыцкія адукацыйныя тэхналогіі. Да распрацоўкі навучальна-даследчыцкіх падыходаў у сістэме шматузроўневай універсітэцкай адукацыі прамыя адносіны мае кіруемая мной кафедра агульнай хіміі, супрацоўнікаў якой я ад душы віншую са святам.

У добры шлях бязмежнага самаўдасканалення, родны універсітэт!

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ
25 кастрычніка 2001 года, чацвер, № 14-15 (1843-1844)

СЛОВА ДЭКАНАМ

> *Я ганаруся тым, што захаваў універсітэт.*
> *Рэктар Парфен Пятровіч Савіцкі*

# Які студэнт

*Універсітэт узгадвае гісторыю свайго станаўлення, а дэканы ўспамінаюць свае студэнцкія гады. Усе дэканы нашага універсітэта, вядома ж, калісьці былі студэнтамі... Яны таксама, як і сённяшнія студэнты БДУ, наведвалі лекцыі, здавалі экзамены, жылі ў інтэрнатах, хадзілі на дыскатэкі... Думаецца, што кожнаму ёсць што ўспомніць.*

*Мы папрасілі дэканаў некаторых факультэтаў узгадаць свае студэнцкія часы і распавесці які-небудзь яркі, цікавы эпізод са свайго студэнцкага жыцця.*

## *Дэкан факультэта журналістыкі, дацэнт Васіль Пятровіч ВАРАБ'ЁЎ*

— Здарылася гэта на другім курсе, амаль 25 гадоў таму, у мінулым стагоддзі...

На тагачасным журфаку сярод маіх аднакурснікаў вучыўся і таленавіты фотакарэспандэнт. Майстра — ад бога, як гаворыцца. Яго здымкамі былі запалонены большасць рэспубліканскіх выданняў. Пачаў працаваць на "Камсамолку" ў Маскве. Стаў пераможцам двух міжнародных фотаконкурсаў.

...І вось у летнюю сесію здаём мы экзамен па сучаснай беларускай мове. Паважаны, знакаміты прафесар прымае дастаткова прынцыпова, патрабавальна. Выходзіць мой аднакурснік пасля экзамена. Разгублены. Пачырванелы. Залікоўка аж трымціць у руках.

— Як яно? Які вынік? Што атрымаў? Няўжо "двойка" ці "тройка"? — пытаюцца сябры па групе.

— Ды не "тройка" і не "двойка", — адказвае майстра фотасправы, — а "Здав"...

Пасля хвіліннай паўзы, мы, другакурснікі, якія ўжо атрымалі адзнакі па сучаснай беларускай мове, доўга не маглі спыніць дружны смех па ўсім журфакаўскім корпусе.



*За плячыма сённяшняга дэкана журфака В.П. Вараб'ёва сем будатрадаўскіх семестраў. Лепшы адпачынак пасля вучобы, па яго перакананні, — праца. Фізічная. Да сёмага поту. На фотаздымку: у акрузе Гера, што ў Германіі, ён расчышчаў лес, які перанёс шквальную буру.*

## *Дэкан факультэта радыёфізікі і электронікі, прафесар Сцяпан Рыгоравіч МУЛЯРЧЫК*

— У сувязі з цяперашнімі захадамі па барацьбе з курэннем у БДУ прыгадваю такі выпадак. На пачатку 1970-х гадоў я быў аспірантам Маскоўскага вышэйшага тэхнічнага вучылішча імя Баўмана, і было мне тады 27 гадоў. Жонка з дачкой жылі ў той час у Мінску, і я часта прыязджаў да іх.

Я тады шмат курыў. І пакуль ішоў ад станцыі метро да вучылішча, не паспеў дакурыць — так і зайшоў з цыгарэтай у будынак вучылішча. Стаўленне да курэння тады ў інстытуце было даволі спакойным. Ішоў я так па корпусе, дайшоў да ліфта і сустрэў прафесара Ю.М. Вінаградава. Тут да нас падыйшоў рэктар вучылішча, акадэмік Г.А. Нікалаеў (ён яшчэ насіў заўсёды зорку Героя Сацыялістычнай працы), павітаўся за руку з прафесарам. І працягвае руку мне. А я ў адной руцэ трымаў партфель, а ў другой — непагашаную цыгарэту, якую схаваў за спінай. І мне нічога не заставалася зрабіць, як узяць цыгарэту зноў у зубы, а яму падаць руку.

Пасля гэтага праз нейкі час да мяне падышлі двое маладых людзей і загадалі, каб я прайшоў з імі. Варта ўзгадаць, што гэтая навучальная ўстанова была адной з самых сакрэтных у былым СССР. І ў гэты момант я адчуў, што мяне прымаюць за шпіёна. Нічога не тлумачачы, мяне завялі ў пакой, дзе былі яшчэ пяць чалавек. Не ведаючы, як сябе паводзіць, я першнаперш запытаўся, дзе можна пагасіць цыгарэту. І тут раздаўся страшэнны рогат — гэта быў штаб па барацьбе з курэннем.



*С.Р. Мулярчык падчас ваенных збораў (5-ы курс)*

Выявілася, што за час маёй адсутнасці ў вучылішчы на машынабудаўнічым факультэце здарыўся пажар. Пасля гэтага быў тэрмінова створаны штаб па барацьбе з курэннем, ва ўсёй установе забаранілі курыць. А тых, хто парушаў гэтую забарону, каралі тым, што месяц трэба было адпрацаваць на месцы пажара. Мяне на першы раз толькі папярэдзілі, а не пакаралі, бо я ні пра што не ведаў.

Дарэчы, у 35 гадоў курыць я кінуў...

## *Дэкан біялагічнага факультэта, дацэнт Уладзімір Васільевіч ЛЫСАК*



*У.В. Лысак (справа) з сябрам С. Чайкам*

— Памятаю, як мы былі студэнтамі і здавалі вельмі складаны экзамен па вышэйшых раслінах. Трэба было ведаць шмат лацінскіх назваў, сістэматыку ўсіх раслін на Зямлі. І трэба было вельмі многа вучыць на памяць. А прымаў у нас экзамен вельмі стары, як нам тады здавалася, дацэнт — было яму каля 70 гадоў. У групе ў нас былі толькі два чалавекі, для якіх гэты экзамен не ўяўляў вялікіх цяжкасцяў, бо гэтыя студэнты-выдатнікі з пятага класа займаліся ў гуртку па біялогіі, потым — пры факультэце ў гуртку юных натуралістаў. І вось мы за пэўную плату дамаўляліся з гэтымі студэнтамі, каб яны сядалі за чалавекам, які адказваў на пытанні, і ціха шапталі правільны адказ. Гэта было няцяжка рабіць, бо стары чалавек, як мы меркавалі, гэтага не заўважыць. Калі ж ён падыходзіў да аднаго з гэтых студэнтаў і казаў: "Мне здаецца, што Вы ўжо адказвалі", — на месца таго сядаў яго сябар. І такім чынам удалося паспяхова здаць экзамен усёй групе.

Быў і яшчэ адзін выпадак. У студэнцкія гады ўвесь час дзе б ні быў наш курс: ці то на практыцы, ці то "на бульбе", — я адказваў за грамадскае харчаванне. Трэба прызнацца, што я сам нядрэнна гатую і люблю гэта рабіць. На другім курсе ў нас была вучэбная практыка ў Налібоцкай пушчы. Жылі мы там у палатках, я быў адказным за харчаванне. Сябры даведаліся пра мой дзень нараджэння. Для мяне быў вялікай нечаканасцю сход з гэтай нагоды. І было вельмі прыемна атрымаць у падарунак прыёмнік "Океан", які, дарэчы, захаваўся ў мяне дагэтуль.

## *Дэкан факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі, дацэнт Павел Аляксеевіч МАНДРЫК*

— Студэнцтва — вельмі яскравая і працяглая старонка ў жыцці кожнага маладога чалавека. Працяглая — таму, што за гэтыя пяць гадоў у жыцці адбываецца мноства падзей, заводзіцца шмат знаёмстваў. А галоўнае — студэнт пазнае шмат новага (і не заўсёды гэта датычыць толькі прафесійных ведаў).

Вядома, асноўны занятак студэнта — гэта навучанне. Асабіста ў мяне з гэтым праблемы не ўзнікалі: мне падабалася вучыцца, і я з ахвотай займаўся. Але чамусьці ў памяці больш застаюцца падзеі, непасрэдна з навучаннем не звязаныя. Гэта і паездкі "на бульбу", у будатрады. А за час навучання я пабываў у многіх будатрадах — і ў Беларусі, і ў Узбекістане, і ў Казахстане.

Прыгадваецца адзін выпадак, які пакінуў яскравы ўспамін. Пасля другога курса (мне тады было толькі 18 гадоў) мяне ўзялі ў будатрад са старэйшымі студэнтамі ў Казахстан. Недзе праз тыдзень пасля пачатку працы нашу каманду накіравалі на пілараму дапамагчы грузіць бярвёны. І трапіўся нам вельмі цяжкі камель. Яго трэба было закінуць на машыну. Мы, 12 чалавек, хвілінаў 15 тапталіся каля гэтага бервяна, падыходзілі да яго з розных бакоў, спрабавалі падняць — анічога не атрымлівалася. І тут падышоў да нас дасведчаны работнік пілорамы: "Хлопцы, што вы тут робіце?" Ён паставіў шэсць чалавек: тры з аднаго боку бервяна, тры — з другога. І аказалася, што мы лёгка паднялі гэты камель.



*П.А. Мандрык у будатрадзе*

Так я атрымаў вельмі каштоўны досвед арганізацыі працы. Калі было 12 чалавек, кожны стараўся хаця б крыху "сачкануць", спадзяваўся на іншых. А калі засталося менш, кожны стаў адчуваць меру сваёй адказнасці.

І сёння, як толькі мне даводзіцца зрабіць што-небудзь важнае і значнае, я заўсёды ўзгадваю, як мы грузілі бярвёны. І разумею, што заўжды трэба адчуваць меру адказнасці.



## *Дэкан фізічнага факультэта, прафесар Віктар Міхайлавіч АНІШЧЫК*

— Успамінаецца такі выпадак. Вучыўся я тады на вячэрнім аддзяленні. І разам з адным аднакурснікам мы вырашылі перавесціся на дзённае. Трэба было даздаваць вялікую розніцу ў экзаменах і заліках. І не такой ужо важнай была адзнака — галоўнае, каб хутчэй гэта зрабіць. На адным з экзаменаў выкладчык падзяліў дошку напалам і паставіў нас па розныя яе бакі, а сам некуды пайшоў. Праз нейкі час вяртаецца, бачыць, што мы не справіліся з заданнем, і — мяняе нас месцамі. І зноў сыходзіць...

У той раз мы так і не здалі экзамен. Атрымалася гэта толькі з чацвёртага разу, калі лепш падрыхтаваліся.

> • *На базе факультэтаў БДУ былі створаны Мінскі медыцынскі інстытут, Мінскі юрыдычны інстытут, Беларускі інстытут народнай гаспадаркі, Мінскі хіміка-тэхналагічны інстытут, які ўвайшоў у склад Беларускага політэхнічнага інстытута, і шэраг іншых. Клінічны гарадок БДУ стаў 1-й гарадской бальніцай, а яшчэ ў 1922—1926 гадах першы бібліятэчны збор БДУ быў ператвораны ў Дзяржаўную бібліятэку Беларусі.*

## *Дэкан факультэта міжнародных адносін, прафесар Аляксандр Віктаравіч ШАРАПА*

— У сярэдзіне чэрвеня 1957 года ад будынка ЦК камсамола Беларусі мы, тры з паловай тысячы студэнтаў Мінска, з'язджалі на цалінныя землі — збіраць ураджай. Сабраўся поўны чыгуначны састаў з адных толькі студэнтаў. Мы ехалі весела — з камсамольскімі песнямі (у дарозе за свае грошы купілі гармонік).

Прыехалі мы ў Какчатаўскую вобласць. Тут, у Какчатаве, адбыўся мітынг, на якім нас вітаў першы сакратар гаркама партыі Кляшчоў. Потым выступаў я, паколькі быў адказным за студэнтаў.

Працавалі мы ў Рузаеўскім раёне Какчатаўскай вобласці, збіралі ўраджай пшаніцы. Па выніках гэтай працы я быў узнагароджаны Ганаровай граматай ЦК камсамола СССР.



*А.В. Шарапа на цаліне (1957 г.)*

25 кастрычніка 2001 года, чацвер, № 14-15 (1843-1844)

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

СЛОВА ДЭКАНАМ

*Пытанне аб Беларускім універсітэце ставіцца як пытанне аб нацыянальнай палітыцы...*
*Рэктар Антон Нічыпаравіч Сеўчанка*

# Не марыць стаць дэканам...

## *Дэкан геаграфічнага факультэта, прафесар Іван Іванавіч ПІРОЖНІК*



І.І. Пірожнік падчас палявых даследаванняў у Карпатах

— Найбольш значнай падзеяй майго студэнцкага жыцця была першая вытворчая практыка ў аддзеле гарадскіх паселішчаў НДІ эканомікі і эканоміка-матэматычных метадаў Дзяржплана БССР. На пачатку 1970-х гадоў актыўна раслі гарады, будаваліся прамысловыя комплексы, якія трэба было забяспечыць працоўнай сілай. Тэмай маіх даследаванняў была маятнікавая міграцыя працоўнай сілы ў Полацкім жыллёва-прамысловым комплексе. Старажытны Полацк і малады, у бурным развіцці Наваполацк, навакольныя вёскі Экімань, Баравуха і іншыя знаходзіліся ў працэсе сацыяльна-эканамічнай і дэмаграфічнай трансфармацыі. На падставе палявых абследаванняў была пабудавана матрычная мадэль міграцый, распрацаваны шэраг прапаноў па аптымізацыі гаспадарчага развіцця. На падставе даследаванняў была напісаная навуковая праца, якая на Рэспубліканскім конкурсе навуковых работ студэнтаў была адзначана І катэгорыяй і ўзнагароджана Дыпломам Міністэрства вышэйшай адукацыі ІІ ступені.

## *Дэкан факультэта фундаментальнай і нетрадыцыйнай медыцыны Дзмітрый Ільіч САГАЙДАК*

— Пасля паездак першага сакратара ЦК КПСС М.С. Хрушчова ў Індыю ў 1958 годзе была знятая забарона на публікацыю матэрыялаў пра ёгу. Многія часопісы (кшталту "Наука и жизнь", "Знание — сила" і інш.) публікавалі захапляльныя факты пра незвычайныя і невытлумачальныя магчымасці чалавека.




Д.І. Сагайдак (злева) і А.М. Люцко — студэнты 2-га курса

Мы, тады студэнты фізічнага факультэта БДУ, з пазіцый матэрыялізму і дыялектычных падыходаў спрабавалі "прывязаць" незвычайныя з'явы да нашай рэальнасці і практыкі. Ёгі без шкоды для ўласнага здароўя маглі піць серную кіслату, глытаць раскаленае да чырвані жалеза і вельмі ядавітых змей. І ў запале гарачай палемікі я заявіў сакурснікам (вось ужо 43 гады гэта мае надзейныя сябры), што нічога надзвычайнага ў гэтым няма — усё залежыць ад установкі псіхікі. І, між іншага, сказаў, што, калі патрэбна, магу і я з'есці што-небудзь не вельмі ядомае — ну, напрыклад, жабу. Стаяў лістапад, усе выхаваныя жабы ўжо залеглі ў зімовую спячку, таму мае сябры адправіліся на біялагічны факультэт па лабараторную жабу. Аднак не знайшлі. Так усё і забылася.

Аднак на наступны год увосень на сельскагаспадарчых работах усе разам прыгадалі маю неабдуманую заяву і знайшлі здаравенную рапуху, усю ў атрутных пухірках. Як вядома, "слова не верабей"; і я, разумеючы, што "чалавек можа ўсё ці амаль усё", вымыўшы рапуху ад пяску, пры вялікім зборы саўдзельнікаў мерапрыемства павольна з'еў яе, каменціруючы смакавыя адчуванні, якія ўзнікалі ў працэсе гэтага.

Гісторыя гэтая атрымала дастатковы розгалас сярод студэнтаў-фізікаў і біёлагаў. Яшчэ доўга пасля таго, праходзячы па калідоры, я чуў услед сабе каментарыі майго ўчынку: "Гэта ён з'еў жыўцом ці то рапуху, ці то пацука".

Я думаю, што нейкія вытокі майго жадання стварыць факультэт фундаментальнай і нетрадыцыйнай медыцыны былі закладзены менавіта гэтай акцыяй.

## *Дэкан юрыдычнага факультэта, дацэнт Валерый Мікалаевіч ГАДУНОЎ*

— На адным са старэйшых курсаў лекцыі па адным з прадметаў чытаў выкладчык-"пагадзінавік". Падчас іспыту ў нашай групе (дзе я быў старастай) ён спытаў мяне першага, паставіў адзнаку "выдатна" і пасадзіў разам з сабой. Калі выкладчык адчуваў сумненні наконт каго-небудзь са студэнтаў групы, я даваў характарыстыку гэтаму студэнту. І сумненні развейваліся. Як правіла, на карысць студэнта. Так працягвалася да таго часу, пакуль у аўдыторыю не ўвайшоў намеснік дэкана. Пасля гэтага мой "удзел" у прыёме іспыту спыніўся.



*• Больш за 450 выкладчыкаў і студэнтаў БДУ пайшлі ў армію, народнае апалчэнне, сталі байцамі знішчальных батальёнаў, партызанамі, падпольшчыкамі. Універсітэт памятае сваіх выхаванцаў, сярод якіх Героі Савецкага Саюза Міхаіл Катлавец і Уладзімір Парахневіч. Да 1945 года за мужнасць і гераізм, праяўленыя ў баях, 293 супрацоўнікі універсітэта былі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі.*

## *Дэкан хімічнага факультэта, прафесар Генадзь Аляксеевіч БРАНІЦКІ*

— Паступіўшы ў 1955 годзе ва універсітэт, я і не меркаваў, што некалі буду ўзначальваць хімічны факультэт. Вучыўся і жыў, як і многія мае аднакурснікі, сціпла, пераважна на стыпендыю (29 рублёў), паколькі дапамагаць мне матэрыяльна мама практычна не магла. Яна жыла ў Фергане, апроч мяне ў яе былі яшчэ двое дзяцей (мае малодшыя сёстры). Бацька загінуў пад Ржэвам у 1942 годзе.



Г.А. Браніцкі ў інтэрнаце

Але пасылкі часам дасылала — пераважна садавіна, арэхі, варэнне, якія з'ядалі тут жа з хлопцамі, з якімі жыў разам у адным пакоі ў інтэрнаце на вуліцы Свярдлова.

Стыпендыю плацілі не ўсім, а толькі тым, хто вучыўся на "добра" і "выдатна". Так што стыпендыю можна было зарабіць добрым навучаннем. І я стараўся, як многія, большую частку часу бавіць у бібліятэцы. Рыхтавацца да заняткаў у інтэрнаце было немагчыма. У адным пакоі афіцыйна жылі чатыры чалавекі, а ў сапраўднасці — шэсць.

Навучальны працэс быў арганізаваны па традыцыйнай для вышэйшай школы схеме: лекцыі, семінары, лабараторныя работы, вытворчая і педагагічная практыка, курсавыя, дыпломныя.

Асаблівасць, якая зараз зусім знікла: многія лекцыі суправаджаліся дэманстрацыйнымі вопытамі. Не магу іх забыць, але нічога не магу зрабіць, каб адрадзіць гэтую традыцыю.

Характэрнай рысай той эпохі быў дух творчасці: студэнтаў прыцягвалі да навуковай працы. Я пачаў займацца навуковай дзейнасцю з другога курса. Адначасова я займаўся грамадскай працай — быў сакратаром камсамольскай арганізацыі хімічнага факультэта (на трэцім і чацвёртым курсах). Рабілася шмат добрага. У 1958 годзе я ездзіў са студэнтамі БДУ на цаліну. Тая паездка з'яднала наш калектыў. Дый увогуле мы былі калектывістамі: дапамагалі адзін аднаму ва ўсім — і ў навучанні, і ў паўсядзённым жыцці.

У 1958 годзе я ўпершыню ездзіў на студэнцкую навуковую канферэнцыю ў Харкаўскі універсітэт. Кафедра неарганічнай хіміі прымала як дарагога госця (здавалася б, падумаеш — прыехаў другакурснік). Выслухалі паведамленне, ацанілі, уручылі грамату. Зараз студэнтаў на канферэнцыі не пасылаем — няма грошай.

Хаця матэрыяльная база факультэта ў той час была далёкай ад ідэалу (як і зараз, калі ўсё знасілася), навуковыя даследаванні выконваліся на высокім узроўні. Многія шкляныя прылады для доследаў рабіліся не толькі намаганнямі шкловыдзімальшчыкаў, але і сваімі ўласнымі. Трэба было праяўляць фантазію ў вырашэнні складаных задачаў з выкарыстаннем простых метадычных прыёмаў.

У студэнцкім жыцці вельмі шмат часу выдаткоўвалася на сходы — камсамольскія, прафсаюзныя і інш. на розных узроўнях: у групах, на курсах, на факультэце, у рамках БДУ, раёна, горада, рэспублікі.

Я ўдзячны акадэміку В.В. Свірыдаву за тое, што ад яго я навучыўся любові і адданасці навуцы, акадэміку Ф.М. Капуцкаму за тое, што далучыў мяне да адміністрацыйнай працы (я працаваў яго намеснікам у дэканаце, дэканам, намеснікам дырэктара НДІ ФХП па навуковай рабоце).

## *Дэкан гістарычнага факультэта, дацэнт Сяргей Мікалаевіч ХОДЗІН*

— *Эпізод 1-ы.* Бульба... Ароніяй лёсу нас з сябрам закінула на выселкі. Асноўная група размясцілася ў цэнтры калгаса. Дзень больш-менш быў заняты на мясцовым элеватары. А вось вечар... Кніг побач апынулася няшмат. Карты надакучылі ўдзень: спрабавалі гуляць на халву (адзінае салодкае, што было ў мясцовым магазінчыку). Спачатку — ва ўзнагароду, пасля — у пакаранне.

Урэшце пазнаёміліся з дзяўчатамі — маладымі даяркамі. Панадзіліся хадзіць па малако на ферму. За гаворкамі ім — весялей працаваць, нам — бавіць час. Вырашылі запрасіць у клуб у суседнюю вёску на танцы. І вось увечары я ("фраер у чаравіках") і сябар у ботах — на ферме. Чаго мне каштавала прабрацца туды ў чаравіках — зразумее кожны, хто хоць раз быў паблізу невялікай фермы ў невялікай вёсачцы. У памяшканні, дзе дзяўчаты мылі "тару", я стаяў на парозе, бо ўсюды вада. Сябар, наадварот, "набіраў ачкі" — дапамагаў, жартаваў. Толькі раптам... знік. Разгублена мы пазіралі на тое месца, дзе ён стаяў хвіліну таму... А ён літаральна ўсплыў. Усё, што да таго часу плавала на паверхні вады, упрыгожвала цяпер яго галаву. Зразумела, выгляд у яго быў зусім не такі, як у пераможцы. Пасля ўжо мы даведаліся, што ў так званай "мыечнай" было некалькі перапоўненых вадою сцёкавых ямаў. Але галоўнае — вынік: дарма сябар спрабаваў памыцца. Вечар быў сапсаваны. Ноччу ўпотай я абліў усё яго адзенне "Трайным" адэкалонам.

*Эпізод 2-і.* Бязмежныя сібірскія прасторы. Па адзінай трасе, якую ўладкоўвалі студэнты інстытута замежных моў, мы даволі хутка былі на станцыі. Нас чакала высокааплочваемая, але не надта прывабная праца грузчыкаў. Аднак груз нас не парадаваў: цэмент да 60 кг ў нетрывалых папяровых мяшках. Іх мы павінны былі грузіць з вагона без прыступак. Зразумела, што, падаючы, мяшок часам разрываўся, і цэментавы "душ" абсыпаў з ног да галавы. Да часу завяршэння "аперацыі" мы ўсе былі непазнавальна "сівыя". На памяць засталося фота — мы ўсе мурзатыя з галавы да ног, а я ў чыстай майцы (для кантрасту). Але галоўнае было наперадзе. У нашай "лазні" не было гарачай вады. Камандзір будатрада заявіў: "Барства гэта, у гарачай вадзе мыцца". Пасля халоднага душу мы тэмпературыць не сталі. Але расліннасці на галаве пазбаўляліся з дапамогай нажніц.



С.М. Ходзін з аднакурсніцамі

Застаецца дадаць: ў дзень перад ад'ездам "пры вясёлым настроі" адзін мяшок цэменту быў зрасходаваны на камандзіра будатрада. Адразаючы яго сцэментаваную гордасць — вусы, наш "цырульнік" прыгаворваў: "Барства гэта, гарачай вадою мыцца."

ІНІЦЫЯТЫВЫ

# БДУ збірае выпускнікоў

Аб'яднаць выпускнікоў БДУ дзеля інтэлектуальнага, творчага і іншага супрацоўніцтва, а таксама дзеля захавання і павелічэння адукацыйных, навуковых і культурных традыцый універсітэта — такая мэта новай грамадскай арганізацыі Асацыяцыя выпускнікоў Беларускага дзяржаўнага універсітэта, якая нядаўна пачала ствараццa.

Жыццё паказвае, што для большасці людзей гады вучобы ў ВНУ не проста запамінаюцца, а становяцца ці не найлепшым перыядам маладосці. Не сакрэт, што аднакурснікі часам збіраюцца разам, каб сустрэцца з улюбёнымі настаўнікамі, даведацца пра лёс адзін аднаго, абмеркаваць агульныя праблемы. Студэнцкае сяброўства часцяком працягваецца ўсё жыццё, а часам становіцца надзейнай гарантыяй добрасумленнасці ў шмат якіх вялікіх і малых справах.

У многіх краінах існуюць разнастайныя аб'яднанні людзей, якія маюць дачыненне да той ці іншай навуковай установы. Далучанасць да такога брацтва, якое падтрымлівае шчыльныя сувязі з alma mater, шмат кажа пра чалавека, часта служачы яго візітоўкай, сведчаннем высокай рэпутацыі ў грамадстве. У сваю чаргу, поспехі выпускнікоў спрыяюць узняццю прэстыжу ВНУ.

Асацыяцыя выпускнікоў Беларускага дзяржаўнага універсітэта, як мяркуецца, возьме на сябе абавязкі па прадастаўленні інфармацыйных паслуг для ўсталявання і пашырэння кантактаў паміж былымі студэнтамі, па арганізацыі іх сустрэчаў, семінараў, канферэнцый. Плануецца стварэнне базы даных пра студэнтаў і выпускнікоў, правядзенне праграм, накіраваных на захаванне традыцый студэнцтва і навукова-педагагічнага калектыву БДУ. Плануецца, што асацыяцыя будзе садзейнічаць у працаўладкаванні выпускнікам БДУ і аказваць дапамогу арганізацыям і прадпрыемствам у падборы высокакваліфікаваных кадраў.

На інтэрнэт-сайце універсітэта з'явіцца адпаведная старонка, на якой будзе змяшчацца падрабязная інфармацыя пра дзейнасць асацыяцыі. Статут гэтай грамадскай арганізацыі знаходзіцца ў апошняй стадыі дапрацоўкі.

Аргкамітэт сёння гатовы разгледзець усе прапановы выпускнікоў Беларускага дзяржаўнага універсітэта, а таксама прымае заяўкі на ўступленне ў асацыяцыю.

*Кантактны тэлефон
у Мінску 209-54-16
(Тацяна Аляксандраўна Белаш)
E-mail: alumni@bsu.by*

*Калектыў універсітэта прыкладзе ўсе сілы да таго, каб і далей па праву несці сцяг флагмана вышэйшай адукацыі рэспублікі.*

*Рэктар Усевалад Міхайлавіч Сікорскі*



Фота IREX/PROMEDIA

ВЫПУСКНІКІ

## *Алена СПІРЫДОВІЧ, тэлевядучая:*

*— Алена, што Вы памятаеце пра сваё студэнцкае жыццё?*

— Смешных выпадкаў я вось так адразу не ўзгадаю, але гады, праведзеныя на факультэце журналістыкі, былі аднымі з самых лепшых у маім жыцці. Ужо на другім курсе ў мяне было дзіця. Я карміла яго, бегла на дзве "пары", таму што на ўсе не паспявала, потым зноў бегла яго карміць. Здавала сесіі, як і ўсе. Не магу сказаць, што гэта была бесклапотная пара, але гэта быў цудоўны час. На журфак я пайшла вучыцца таму, што ціха ненавідзела матэматыку (прызнацца, я і сёння блытаюся ў табліцы множання), а вось тэксты я запамінала старонкамі, яшчэ не ведаючы, навошта мне гэта патрэбна. У школе я была выдатніцай, а ва універсітэце перамясцілася да сераднякоў.

*— Ці можаце Вы ўзгадаць сваіх выкладчыкаў?*

— Выкладчыкаў я памятаю ўсіх, нават складана некага асобна вылучыць. Добра запомніўся Рыгор Васільевіч Булацкі — тагачасны дэкан факультэта журналістыкі. Тое, чаму мяне навучыла на занятках рускай мовы Ангеліна Аляксандраўна Рудэнка, я скарыстоўваю ўсё жыццё.

Я ўдзячная выкладчыкам нават за тыя, не з першага разу здадзеныя залікі, за тое, што я два разы за 5 год навучання была без стыпендыі. Я вельмі ўдзячная выкладчыкам, і сёння мне не сорамна за атрыманыя веды.

*— І на заканчэнне: што Вы можаце пажадаць студэнтам БДУ?*

— Больш прычын для ўсмешак і менш — для суму!

## *Алег СЛУКА, намеснік міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь:*

*— Што Вы можаце прыгадаць з далёкіх гадоў свайго навучання ва універсітэце?*

— Запомнілася ўвогуле студэнцкае жыццё, бо менавіта ў гэтыя гады чалавек часцей за ўсё ўпершыню праяўляецца як творца...

Напэўна, самае галоўнае, што запомнілася, — гэта сяброўства. А яшчэ асабліва запомнілася сустрэча з М.А. Шолахавым (на якой я прысутнічаў, калі быў камандзірам студэнцкага атрада журфака), паездкі ў Казахстан (рамантыка!).

*— Зараз Вы займаеце пасаду намесніка міністра адукацыі і працягваеце выкладаць у БДУ. Ці хапае Вам часу і сіл, каб так працаваць?*

— Я і дагэтуль з'яўляюся прафесарам БДУ і факультэта журналістыкі. Адарвацца ад універсітэта — значыць, адарвацца ад жыцця, згубіць той імпульс, які гарыць у душы. Усё, чаму я навучыўся, усё, што маю, я павінен аддаць студэнтам. А студэнты, у сваю чаргу, павінны працаваць. І працаваць — з задавальненнем. Я хачу, каб студэнты БДУ былі шчаслівыя, каб яны былі забяспечаныя — як матэрыяльна, так і духоўна.

Усё будзе мяняцца. Пройдуць стагоддзі, тысячагоддзі, аднак універсітэт застанецца, бо ён прываблівае да сябе ўсё, што мае дачыненне да розуму.

*Гутарылі студэнты факультэта журналістыкі
Вольга НАВАЦКАЯ і Сяргей АКУТКА*

## *Аляксандр РАЧЭЎСКІ, начальнік аддзела міжнароднага супрацоўніцтва Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя:*

— Найбольш ярка запомніліся з майго студэнцкага жыцця выкладчыкі з вялікімі энцыклапедычнымі ведамі. Узгадваюцца імёны В.П. Якушка, В.Р. Заўрыева, А.Я. Шкляра, В.А. Дзяменцева, а таксама многіх іншых. Нельга не ўзгадаць і эпізодаў, звязаных з непасрэднай навуковай работай студэнта пад кіраўніцтвам В.П. Якушка. Такія экспедыцыі на азёрныя вадаёмы Беларусі адбываліся двачтры разы на год. Дзякуючы ім мы аб'ездзілі большую частку Беларусі. Гэта была выдатная практыка, якую можна без перабольшання назваць экспедыцыйным даследаваннем роднага краю. Дзякуючы такім паездкам я пазнаёміўся з беларускай прыродай і яе самымі цудоўнымі рэсурсамі — воднымі. Пазней ахова і рацыянальнае выкарыстанне гэтых рэсурсаў стала сэнсам майго жыцця.

У год 80-годдзя БДУ хацелася б напомніць пра падтрымку добрых традыцый універсітэта і факультэтаў. Вельмі пажадана, каб высокі навуковы, прафесійны і педагагічны патэнцыял выкладчыкаў падмацоўваўся працай студэнцкіх навукова-даследчых гурткоў. Каб, як і ў гады майго навучання, вакол прафесара і выкладчыка студэнтаў злучалі агульныя інтарэсы. І каб гэтыя выкладчыкі сваім асабістым прыкладам асвятлялі шлях у навуку для маладых, а маладыя яго знаходзілі.

Геафак заўсёды адрозніваўся іскрамётным характарам: акрамя навукі, тут шырока былі распаўсюджаныя канцэрты, вечарыны, гульні КВЗ. Хацелася б, каб вясёлы характар і мастацкая самадзейнасць існавалі і надалей. Каб і надалей геафак традыцыйна вылучаўся высокай паспяховасцю.

Сёння геафак і некаторыя іншыя факультэты атрымалі прыгожыя будынкі. І хацелася б такую цудоўную абстаноўку захаваць у БДУ і надалей, бо ўражанні ад сучаснага геафака — гэта найбольш яркія мае ўражанні пра БДУ сёння.

*Гутарыў студэнт
геаграфічнага факультэта
Вадзім ЗУБРЫЦКІ*

*• 11 кастрычніка 1943 года ў будынку школы на станцыі Сходня пад Масквой пачаліся рэгулярныя навучальныя заняткі. Некаторыя факультэты і курсы размяшчаліся ў будынках Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта. Лекцыі студэнтам чыталі вядомыя вучоныя: У.І. Пічэта, М.М. Дабрынін, Б.Д. Грэкаў, М.В. Нечкіна і інш. У жніўні 1944 года БДУ пераехаў у вызвалены Мінск, а ўжо ў верасні пачаў працу.*

ВІНШУЕМ!

# У бібліятэкі таксама юбілей

*Фундаментальная бібліятэка БДУ, як і ўвесь універсітэт, адзначае сваё 80-годдзе. З яе дырэктарам Пятром Міхайлавічам ЛАПО гутарыць наш карэспандэнт.*

*— Бібліятэцы БДУ — 80 гадоў. Якой яна стала сёння? Які яе фонд?*

— Фонд бібліятэкі складае больш за 2 мільёны адзінак захавання, сярод якіх ёсць кнігі, часопісы, газеты, аўдыё- і відэакасеты, кампакт-дыскі. Фонд размеркаваны паміж галоўным кнігасховішчам і чытальнымі заламі, размешчанымі ў галоўным будынку універсітэта і на геаграфічным, радыёфізічным, філалагічным, хімічным, юрыдычным факультэтах, а таксама на факультэце журналістыкі і на факультэце даўніверсітэцкай адукацыі. У бібліятэцы нам хацелася б рэалізаваць канцэпцыю адкрытага доступу: чытач павінен мець непасрэдны доступ да фонду, які захоўваецца ў чытальнай зале, а бібліятэкар выступаў бы ў ролі дарадцы, кансультанта, які дапамагаў бы чытачу знайсці патрэбнае яму выданне. Зараз мы спрабуем апрабаваць гэтую канцэпцыю ў філіяле, размешчаным на геаграфічным факультэце.

Новыя выданні да нас апошнім часам паступаюць, на жаль, нерэгулярна. Прычына тут адна — фінансы. Мы не маем прэтэнзій ні да кіраўніцтва універсітэта, ні да работнікаў планава-эканамічнай і бухгалтарскай службаў універсітэта, бо разумеем, што універсітэт зараз абнаўляе сваю навучальна-вытворчую базу. Але хочам звярнуць іх увагу на асаблівасці камплектацыі бібліятэчнага фонду. Калі пакупку стала ці камп'ютэра можна адкласці на некаторы час, дык адтэрміноўка аплаты за літаратуру, неабходную для забеспячэння навучальнага працэсу, прыводзіць да таго, што нашыя заказы ў выдавецтвах расфарміроўваюцца і прадаюцца іншым бібліятэкам. Такія страты часам проста немагчыма папоўніць...



Фота IREX/PROMEDIA

*— Бібліятэка ў БДУ вялікая. Можа трэба паклапаціцца пра асобнае памяшканне: і супрацоўнікам зручней, і чытачам вальней?..*

— Так, у бібліятэцы зараз 16 аддзелаў, сярод якіх ёсць і аддзелы абслугоўвання, і тыя, што выконваюць унутрыбібліятэчныя аперацыі. Сёння ў нас ёсць і месца для новага будынка бібліятэкі, і ўся праектная дакументацыя, неабходная для пачатку будаўніцтва. Гэты архітэктурны праект распрацаваны пры ўдзеле вядучых спецыялістаў бібліятэкі з улікам заўваг замежных экспертаў — спецыялістаў у галіне дызайну і абсталявання бібліятэчных будынкаў з Францыі і Польшчы. Наш план будаўніцтва падтрымлівае кіраўніцтва універсітэта, але пакуль што для яго ажыццяўлення ёсць пэўныя перашкоды.

*— А ці плануецца пашырыць стурктуру бібліятэкі: увесці новыя аддзелы, напрыклад?..*

— Канешне. Ужо ў самы бліжэйшы час мы мяркуем стварыць такія службы, як сектар электроннай дастаўкі дакументаў і сектар лінгвістычнага забеспячэння.

*— Але, мабыць, новаўвядзенні датычаць не толькі новага будынка. XXI стагоддзе — эпоха камп'ютэраў. Ці захапіла хваля камп'ютэрызацыі бібліятэку БДУ?*

— Сёння ніякую прафесійную дзейнасць (а тым больш — інфармацыйную) немагчыма ўявіць без выкарыстання камп'ютэрнай тэхнікі. На жаль, часта лічаць, што дастаткова паставіць камп'ютэр на працоўнае месца, падключыць яго да сеткі (пажадана — глабальнай) — і ўсе праблемы інфармацыйнага забеспячэння прафесійнай, навуковай ці навучальнай дзейнасці будуць вырашаныя. Але кожны, хто хоць крыху разбіраецца ў бібліятэчнай спецыфіцы і сочыць за Інтэрнэтам, можа заўважыць: тэхналогіі пошуку, якімі бібліятэчная справа карыстаецца ўжо працяглы час, у сусветнай сетцы знаходзяцца яшчэ ў зародкавым стане. Новыя інфармацыйныя тэхналогіі павінны кардынальна змяніць аблічча бібліятэкі, формы інфармацыйнага абслугоўвання, якія яна прапануе, і прэстыж бібліятэкара ў грамадстве, як мы спадзяемся. У Інтэрнэце ўжо ёсць электронны каталог нашай бібліятэкі, можна наведаць яе Web-старонку. І мы вядзем далейшую працу ў гэтым накірунку.

*— А якіх эмоцый больш у Вас выклікае праца — станоўчых ці адмоўных?*

— Радуе мяне ў бібліятэцы, найперш, яе калектыў, які нягледзячы на цяжкасці працуе з максімальнай аддачай і стараецца годна несці званне вядучай бібліятэкі вядучай ВНУ краіны. Радуе стаўленне кіраўніцтва універсітэта да бібліятэкі, тая ўвага, якую яно надае вырашэнню нашых праблем. А засмучае тое, што працаваць даводзіцца ў складаных умовах — і ў сэнсе плошчаў, і ў сэнсе штатнага раскладу, і ў сэнсе фінансаў.

*— Што б Вы хацелі пажадаць нашым чытачам?*

— Хацелася б пажадаць ім наведаць новую бібліятэку універсітэта праз 5 гадоў — каб яны пабачылі тыя змены, што адбудуцца ў ёй за гэты час.

*Студэнтка факультэта журналістыкі
Кацярына ДЗЯМЕНЦЬЕВА*

*Галоўная задача універсітэта – абудзіць у сваіх выхаванцах неўтаймаванасць у спасціжэнні ведаў.*
*Рэктар Уладзімір Аляксеевіч Белы*

**ГАВОРАЦЬ СТУДЭНТЫ**

# Пяць гадоў шчаслівага жыцця

*Напярэдадні 80-годдзя БДУ мы вырашылі задаць некалькі пытанняў студэнтам нашага універсітэта. Пытанні былі простымі і датычыліся пераважна цяперашняга дня Беларускага дзяржаўнага універсітэта і яго будучыні:*

*1. Што новага, на вашу думку, з'явіцца ў БДУ ў гэтым стагоддзі?*
*2. Што б вы хацелі палепшыць у БДУ?*
*3. Што яшчэ вам дае БДУ, акрамя адукацыі?*
*І вось якія адказы мы атрымалі...*

*Сяргей, факультэт журналістыкі:*

1. На мой погляд, у новым стагоддзі абавязкова павінны адрамантаваць ліфт на факультэце журналістыкі.

2. Я б палепшыў бібліятэчны фонд БДУ. Гэта дастаткова складана, напэўна, але трэба старацца.

3. Акрамя адукацыі, БДУ дае мне, як і многім іншым студэнтам, новых цікавых сяброў.

*Вольга, хімічны факультэт:*

1. У XXI стагоддзі БДУ, я думаю, пастараецца пашырыць міжнародныя сувязі.

2. Хацелася б змяніць спосаб правядзення лекцый. Я думаю, было б добра, калі б лекцыі ў БДУ былі больш інтэрактыўнымі, каб быў дыялог паміж лектарам і студэнтамі, а не проста маналог выкладчыка. Здаецца, так цікавей.

3. БДУ дапамагае знаходзіць сапраўдных сяброў.



Фота IREX/PROMEDIA

*Святлана, факультэт журналістыкі:*

1. Усё, што з'явіцца новага ў БДУ ў гэтым стагоддзі, будзе залежаць толькі ад людзей, якія прыйдуць ва універсітэт у XXI стагоддзі.

2. Трэба пашырыць памяшканні факультэтаў, каб студэнты адчувалі сябе больш вольна, палепшыць тэхнічнае абсталяванне.

3. Акрамя прэстыжу, які мае дыплом БДУ, універсітэт не дае мне нічога.

*Павел, фізічны факультэт:*

1. Мабыць, увядуць 10-бальную сістэму адзнак.

2. Палепшыць хочацца спартыўную базу, а таксама ўмовы пражывання ў інтэрнатах. На мой погляд, большасць з іх патрабуе рамонту.

3. Сяброў, проста магчымасць пагутарыць з цікавымі людзьмі, але гэта, на мой погляд, дае не толькі універсітэт.

*Аляксей, фізічны факультэт:*

1. Адрамантуюць фізічны факультэт, на што я вельмі спадзяюся.

2. Палепшыць трэба стан будынка галоўнага корпуса БДУ.

3. Акрамя адукацыі, БДУ дае проста 5 гадоў бесклапотнага жыцця.

*Марына, філалагічны факультэт:*

1. З'явіцца новая сістэма адукацыі, а яшчэ, на маю думку, навучальны працэс будзе камп'ютэрызаваны.

2. Палепшыць абсталяванне на ўсіх факультэтах, знешні выгляд карпусоў.

3. БДУ дае, акрамя адукацыі, шматлікія забавы.

*Настасся, біялагічны факультэт:*

1. Чамусьці мне здаецца, што з'явіцца ў XXI стагоддзі нейкая новая сістэма навучання ў БДУ. А яшчэ новыя падручнікі, апошнія тэхнічныя навінкі.

2. Палепшыць хацелася б сістэму харчавання студэнтаў, зрабіць больш разнастайным меню ў сталоўках і буфетах. Дый не дрэнна было б панізіць кошты.

3. Акрамя адукацыі, БДУ дае мне магчымасць пазнаёміцца з горадам (напрыклад, да таго часу, пакуль я не паступіла на біяфак, я не ведала пра існаванне Шчамыслiцы). А таксама — з жывой прыродай (падчас заняткаў фізкультуры ў гаі).



Фота IREX/PROMEDIA

*Вераніка, факультэт журналістыкі:*

1. У XXI стагоддзі БДУ пастараецца стварыць амаль поўнае падабенства еўрапейскай сістэмы адукацыі.

2. Хацелася б, каб стыпендыю атрымоўвалі ўсе, незалежна ад формы навучання — "бюджэтнікі" і "платнікі".

3. БДУ дае мне магчымасць знаёміцца з неардынарнымі людзьмі (у тым ліку і з выкладчыкамі).

*Да студэнтаў БДУ чаплялася*
*студэнтка факультэта журналістыкі*
*Кацярына ДЗЯМЕНЦЬЕВА*

**НАШ КОНКУРС**

# Прафесар пакрыўдзіўся...

*Гэтая гісторыя здарылася прыкладна дваццаць гадоў таму. Тады, калі мае бацькі былі такога ж узросту, як і я цяпер. Вучыліся яны таксама ў БДУ, аднак на механіка-матэматычным факультэце. І святкавалі тады не 80, а 60 гадоў з дня нараджэння універсітэта.*

*Свае студэнцкія гады бацькі памятаюць вельмі добра. І лічаць, што гэта быў сапраўды самы лепшы і цудоўны час. Шмат цікавых гісторый пра студэнцтва расказалі яны. Аднак больш за ўсё мне спадабалася наступная...*

— Нішто сабе, тры семінары запар! Ці магчыма вытрымаць такую вялікую нагрузку ў канцы тыдня? Як-ніяк, але сёння субота. Разумею, калі б што-небудзь просценькае, а то — усе тры матэматыкі. Не, я так больш не магу. Тэрмінова трэба адпачыць, інакш з мазгоў хутка дым паваліць!

— Сапраўды, у нас у гэтым семестры амаль 70 % наведвальнасці. Нейкі незвычайны выпадак. Трэба гэтую справу паправіць. Ведаеце, я паважаю выкладчыка, але сядзець на апошняй пары мне штосьці зусім не даспадобы.

— І то праўда. Калегі, а што сёння паказваюць у "Цэнтральным"? Нешта я даўнавата туды не заглядаў...

— Ну, галасуем: хто за кінатэатр? Адзін, два... дзесяць... дваццаць адзін. Прымаецца аднагалосна! У нас ёсць пяць хвілін, каб пакінуць памяшканне. Хутчэй збірайце манаткі!

— Але неяк няёмка атрымліваецца. Што будзе, калі ўсё гэта на сесіі залічыцца?

— Залічыцца-залічыцца: залік табе на экзамене паставяць. Ніхто нікога не прымушае. Аднак потым не хныкай: "Я хачу ў кіно. Складзіце мне, калі ласка, кампанію".

— Дзяўчаты, не спрачайцеся! Усё будзе добра. Ён у нас самы цудоўны "препод". Усіх разумее. Таксама быў маладым. Мусіць, першым з лекцый збягаў. І ўжо напэўна, у дэканат заяўляць не будзе.

Каб выкладчык не шукаў групу па ўсіх туалетах і спартыўных залах, клапатлівыя студэнты пакінулі на дошцы запіску: "Мы пайшлі ў кіно. Не сумуйце. 7 група".

Але не паспелі навучэнцы пакінуць аўдыторыю, як у дзвярах з'явіўся прафесар. Безумоўна, ён адразу заўважыў разгубленасць на тварах хлопцаў і дзяўчат. І не мінуў кінуць позірк на дошку.

— Як вам не сорамна? — спытаўся выкладчык, гледзячы на апушчаныя галовы. — Я вам заўсёды верыў, заўжды ішоў насустрач. А што атрымліваецца? Нават павагі анiякай не засужыў!

Моладзь маўчала, бо ведала: лепей не перапыняць. Наогул, падчас гэтага маналогу група даведалася пра сябе шмат новага.

А выкладчык працягваў:

— Гэта мне, старому чалавеку, трэба было валачыцца праз столькі калідораў, каб прыйсці і даведацца, што вы накіроўваецеся ў кіно? Няўжо было цяжка падняцца на кафедру і папярэдзіць, што заняткі адмяняюцца, каб я не бегаў па бясконцых лесвіцах? А яшчэ лепей — запрасіць пайсці разам з вамі. Усё, таварышы, праз тры секунды я нікога не павінен тут бачыць...

*Кацярына ХАРЫНА,*
*студэнтка І курса*
*факультэта журналістыкі*

*• Калектыў БДУ ганарыцца, што пад статутам ААН стаяць подпісы двух яго прафесараў – У.М. Перцава і Ф.П. Шмыгава.*

**ШКОЛА ПЕРШАКУРСНІКА**

# Асабісты дзённік

*Я – слова, што вучыцца гаварыць,*
*думка – што вучыцца думаць,*
*жыццё – што вучыцца жыць.*

## *18 ліпеня. Субяседванне з дэканам*

Дзве гадзіны доўжылася гэтае нясцерпнае чаканне. Як доўга і нудна. І ў той жа час — як мала ў параўнанні з гадамі падрыхтоўкі да паступлення. Вось і збылася яна, галоўная мара апошніх гадоў. Ад дэкана пачула віншаванні і фразу, якой чакала і пасля якой нічога ўжо не чула: "Вы залічаны".

## *30 жніўня. Засяленне ў інтэрнат*

Вось і скончыліся летнія вакацыі. Я прыехала ў Мінск, які цяпер — мой горад. Прыехала, каб засяліцца ў інтэрнат, які цяпер — мой дом. Прыехала, каб вучыцца на журфаку, які цяпер — мой факультэт. Сабраўшы за пяць гадзін усе паперкі, я нарэшце патрапіла на вуліцу Курчатава, 8. Гэта і ёсць інтэрнат? Выбачайце, мне здаецца, ён хутчэй падобны да жылога дома сучаснага тыпу для асабліва забяспечаных! Нездарма журфак — самы прэстыжны факультэт самага прэстыжнага універсітэта.

## *31 жніўня. Сход на факультэце*

Упершыню ў гэтай зале... Калі прыблізна, без падліку — сабралося чалавек дзвесце. У кожнага — свае надзеі, чаканні і спадзяванні. Адбылася першая сустрэча з выкладчыкамі і куратарамі. Дэкан растлумачыў новую сістэму навучання. Выкладчыкі сказалі прывітальныя і віншавальныя словы першакурснікам. І пачалася доўгачаканая працэдура ўручэння студэнцкіх білетаў і заліковак. Цяпер сапраўды адчуваеш сябе студэнтам БДУ, а значыць — часткай гэтай вялікай і яркай супольнасці, што ўмее вучыцца і адпачываць, умее жыць на поўную моц — жыць па-студэнцку.

## *1 верасня. Дзень першакурсніка*

"Віват, студэнт!" — так называлася феерычная дзея, прысвечаная Дню першакурсніка. Канцэрт праходзіў у мінскім Палацы спорту і падрыхтаваны быў на вышэйшым узроўні. Самым эфектным быў выхад (а дакладней, выезд) рэктара БДУ А.У. Казуліна. Дарэчы, там жа нас упершыню пазнаёмілі з гербам і сцягам універсітэта. Сама канцэртная частка прайшла на "ўра", разоў восем зала апладзіравала стоячы. Слёзы на вачах выступілі толькі аднойчы, падчас выступлення універсітэцкай каманды КВЗ — слёзы ад смеху. А напрыканцы ўсіх запрасілі на дыскатэку. Так прайшло першае знаёмства з вясёлым студэнцкім жыццём.

## *3 верасня. Першы працоўны дзень*

Лекцыі праходзілі ў актавай зале. Атмасфера адразу ж настройвала на хвалю сур'ёзнасці. Пачаўся новы этап у жыцці — перыяд цяжкой і напружанай працы, самы важны і самы, відаць, цікавы. Першае блізкае знаёмства з групай і куратарам. Першыя лекцыі. Усе выкладчыкі — прафесіяналы вышэйшага рангу, амаль кожны мае тую ці іншую навуковую ступень. Ці ж не вялікі гэта гонар — навучацца ў такіх людзей?

*8 кастрычніка.*
*Звычайны вучэбны дзень.*

*...*

*Студэнтка І курса*
*факультэта журналістыкі*
*Аляксандра БОХАН*

